совершившими очень серьезное преступление против духа земли. Это все равно что выбросить тело в далекий чужой кустарник. Традиция Коса в Южной Африке требует, чтобы во время погребения старейшина семьи находился рядом с трупом и объяснял его духу, что происходит.

Похороны в Африке – это серьезный бизнес, но в целом африканцы люди рассматривают соблюдение погребальных обычаев как обряд посвящения и проявление уважения со стороны членов семьи, друзей и доброжелателей, переживших тяжелую утрату.

ЛИТЕРАТУРА:

1. Death and Burial in the African Context: A Case Study On Kenyan Customs And Kenyan Customary Law [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://hitchhikersguidetolaw.wordpress.com/2015/06/15/death-and-burial-in-the-african-context-a-case-study-on-kenyan-customs-and-kenyan-customary-law/. – Дата доступа: 07.10.2022.

2. Dimgba, D. E. Burial Customs in West Africa and Seventh-day Adventists / D. E. Esowe [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://encyclopedia.adventist.org/article?id=2CVI. – Дата доступа: 07.10.2022.

3. Adebowale, B. A. Funeral rites: a reflection of the afterlife in ancient Greece and Yoruba traditional belief / B. A. Adebowale [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.researchgate.net/publication/331382986_FUNERAL_RITES_A_REFLECTION_OF_THE_AFTERLIFE_IN_ANCIENT_GREECE_AND_YORUBA_TRADITIONAL_BELIEF. – Дата доступа: 07.10.2022.

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА І КУЛЬТУРА

## ВЫКАРЫСТАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КУЛЬТУРНЫХ ТРАДЫЦЫЙ ПРЫ АСВЕЦЕ БАЦЬКОЎ ВУЧНЯЎ ІІ КЛАСА Ў ГАЛІНЕ МОЎНАЙ КУЛЬТУРЫ

**Адарцэвіч Н. А.**

Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. Янкі Купалы
Навуковы кіраўнік – к. філал. н, дацэнт Лапкоўская А. М.

Праблема развіцця моўнай культуры вучняў набывае ў наш час усё большае грамадскае значэнне, таму што яно з’яўляецца важным паказчыкам духоўнай культуры не толькі адной асобы, але і ўсёй нацыі.

У сучасным грамадстве асновы маральных каштоўнасцяў закладваюцца ў сям’і. Таму неабходна будаваць адукацыйны працэс такім чынам, каб узаемадзейнічаць не толькі з вучнямі, але і з іх бацькамі [1].

Ва ўмовах, калі большасць сем’яў заклапочана рашэннем праблем эканамічнага дабрабыту, узмацнілася тэндэнцыя самаўхілення многіх бацькоў ад вырашэння пытанняў выхавання і асобаснага развіцця дзіцяці [2]. Бацькі, не

Репозиторий ГрГУ

валодаючы дастатковым веданнем, часам ажыццяўляюць выхаванне ўсляпую, інтуітыўна. Усё гэта, як правіла, не прыносіць пазітыўных вынікаў.

З мэтай вызначэння адукацыйных патрэб бацькоў, для ўзгаднення выхаваўчых уздзеянняў на дзіця мы пачалі працу з анкетавання «Традыцыі маёй сям'і».

На аснове сабраных даных можна зрабіць вынік аб тым, што ўсе бацькі ведаюць, што традыцыі – гэта гістарычна складзенныя звычаі, нормы паводзін і зносін, погляды, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне.

Большасць бацькоў лічаць, што ведаюць беларускія нацыянальныя традыцыі, але акрамя свят, нічога не змаглі назваць.

На пытанне «Ці дапамагаюць нацыянальныя культурныя традыцыі фарміраваць моўную асобу вашага дзіцяці? » 17 бацькоў адказалі станоўча і 1 адмоўна.

16 бацькоў лічаць, што ў народа могуць з'яўляцца новыя традыцыі і 2 прытрымліваюцца іншага меркавання.

Адной з сучасных традыцый з'яўляецца правядзенне ў сярэдзіне ліпеня Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар». Дзякуючы чаму пра беларусаў ведаюць у многіх рэгіёнах свету.

Большасць рэспандэнтаў бачыць каштоўнасць у вонкавай праяве традыцый з прычыны таго, што ведаюць толькі святы і імі ганарацца.

Разам з тым, 11,1 % з апытаных не падтрымліваюць гістарычныя традыцыі ў сваёй сям’і, аднак 94,4 % упэўненыя ў немагчымасці і недапушчальнасці страты традыцый, пры тым 100 % сцвярджальна адказалі пра важнасць ведаў і падтрымання традыцый.

Менавіта ўпэўненна сцвярджаць аб адсутнасці падтрымкі традыцый у сваёй сям’і могуць толькі тыя, хто не разумее сэнс слова «традыцыі». Кожны беларус паважае сваю нацыянальную кухню: дранікі, бабка, мачанка, калдуны, клёцкі. Нават пры зносінах людзі карыстаюцца традыцыйнымі выказваннямі.

Большая частка рэспандэнтаў лічыць дапушчальным супярэчнасці паміж трывалымі традыцыямі і сучаснымі поглядамі, разам з тым, 98 % бацькоў лічаць магчымым з’яўленне новых традыцый, што падмацоўваецца згодай 16 з 18 рэспандэнтаў са сцвярджэннем пра тое, што «памрэ народ, які забыў традыцыі».

Сцвярджэнне пра тое, што традыцыі дапамагаюць у развіцці моўнай культуры, не падтрымаў толькі адзін з рэспандэнтаў.

Аналіз анкеты ў цэлым паказаў неабходнасць правядзення дадатковай работы з бацькамі вучняў, надання асаблівай увагі праблеме развіцця маўленчай культуры, абазначэння ролі і месца устойлівых традыцый у выхаванні будучых пакаленняў.

На бацькоўскіх сходах былі абмеркаваны адметныя асаблівасці беларускай мовы, у тым ліку выкарыстання апострафа, ў кароткага.

Таксама мы ўспомнілі пра вытокі беларускага пісьменства, трансфармацыі алфавіту ад лацінкі да сучаснага фармату, пазначылі небяспекі выкарыстання «трасянкі» пры зносінах з дзецьмі, як аднаго з асноўных

Репозиторий ГрГМУ

фактараў прышчаплення няправільнай культуры маўлення і спрыяння страце самабытнасці беларускай мовы.

З бацькамі была абмеркавана тэма працэсу словаўтварэння, запазычання і з'яўлення новых слоў, прапрацаваны асноватворныя паняцці «культура», «маўленне», «традыцыя».

У ходзе правядзення дадатковай працы з бацькамі яны паказвалі сваю зацікаўленасць у абмяркоўваемых тэмах, прызнаваліся ў некаторых «пробелах» у ведах роднай культуры.

Вынікам праведзенай працы стала 100 % згода бацькоў са сцвярджэннем пра дапамогу традыцый у развіцці маўленчай культуры, а таксама ўсведамленне імі немагчымасці поўнай адсутнасці падтрымання традыцый у сям'і ў тым ці іншым праяўленні.

Атрыманыя звесткі дазваляюць зрабіць выснову аб дапушчальнай адэкватнасці і дастасавальнасці прапанаваных тэм для прапрацоўкі з бацькамі з мэтай спрыяння развіцця маўленчай культуры дзяцей праз прызму устояных традыцый у нашым грамадстве.

Такім чынам, сучасная сацыякультурная прастора дыктуе свае правілы і ўстаноўкі па развіцці і адаптацыі дзіцяці ў грамадстве, аднак менавіта ўхіл у бок папулярызавання нацыянальнай культуры і традыцый забяспечыць усе ўмовы для захавання самавызначэння беларусаў.

ЛІТАРАТУРА:

1. Протчанка, В. У. Роднае слова – крыніца развіцця асобы, духоўнасці народа / В. У. Протчанка // Адукацыя і выхаванне. – 1994. – № 12. – С. 60–65.

2. Ушинский, К. Д. Родное слово / К. Д. Ушинский // Собрание сочинений: в 2 т. – М., 1948. – Т. 2 : Педагогические статьи. – С. 554–574.

## ПРЫРОДА У ТВОРЧАСЦІ Я.КОЛАСА

**Белогур Е. Ф.**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі універсітэт

Навуковы кіраўнік – Варанец В. І.

Якуб Колас любіў і шанаваў родную прыроду, таму ў яго творах напрацягу ўсяго жыцця можна пабачыць заклік да злітнасці з прыродай і яе цудоўнымі з’явамі. Як адзначыў літаратуразнаўца М. Мушынскі, “Колас-пейзажыст – гэта перш за ўсе мастак-філосаф, які ўмеў схопліваць жыццё ва ўсім багацці яго змен, у руху і разам з тым у яго цэласнасці” [1, с. 5].

Якуб Колас быў адкрывальнікам прыгожага і цудоўнага ў беларускай прыродзе. Так, у яго творах гучалі элегічныя песні-жальбы, сацыяльныя матывы, але разам з тым нельга не адчуць, што ён з вялікім захапленнем і любоўю паэтызаваў "вобразы мілыя роднага краю" (верш "Родныя вобразы"). Нягледзячы на сацыяльную заглыбленасць погляду на свет, Якуб Колас не

Репозиторий ГрГМУ